

*Свята*

# Ад народных вытокаў

## Калядавалі-шчадравалі — на ўвесь год багацця і шчасця пажадалі!

У нядзелю, напярэдадні старога Новага года, па вуліцах горада прайшлася са спевамі і танцамі пярэстая кампанія персанажаў беларускіх зімовых святаў і заглянула да галоўнай ёлкі. Там адбылося прадстаўленне калектываў — удзельнікаў фальклорнага фэсту «Як на Шчодрую куццю».

З гэтай падзеі распачаліся мерапрыемствы рэспубліканскай акцыі «Пінск — культурная сталіца 2019». І вельмі сімвалічна, што пінчукі перш за ўсё звярнуліся да народных традыцый. Бо менавіта выкананне абрадаў Калядаў і Шчадрухі садзейнічае спрыяльнаму і дабрадзейнаму ходу ўсяго года.

На свята да гараджан завіталі самадзейныя гурты з Малоткавічаў, Кашавічаў, Ахова. Разам з імі святочны настрой стваралі славутыя ансамбль «Палескія зоры», хор «Журавушка». Можна лічыць дэбютам выступленне дзіцячага фальклорнага калектыву ГДК «Бацькаўшчына».

Мы знаходзімся напярэдадні знамянальнай падзеі: 25 студзеня ў ГДК прызначаны ўрачыстая цырымонія прынята статусу «Культурная сталіца года» і гала-канцэрт, прымеркаваны да адкрыцця рэспубліканскай акцыі «Пінск — культурная сталіца 2019».

Фота Вячаслава **ІЛЬЯНКОВА.**